ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад упраўлення адукацыі
Гродзенскага аблвыканкама
31.12.2014 № 390

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

# «ГРОДНАЗНАЎСТВА»

**VI – X (XI) класы**

Аўтары – Карнялюк Віталь Рыгоравіч, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», кандыдат гістарычных навук;
Рабкоў Аляксандр Сяргеевіч, настаўнік гісторыі дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 28 г. Гродна»

Гродна 2014

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс «Гродназнаўства» з'яўляецца краязнаўчай дысцыплінай. Ён уключае ў сабе веды па гістарычнаму, геаграфічнаму, экалагічнаму, літаратурнаму краязнаўству горада Гродна. Сваім зместам курс інтэгрыруецца з тымі ведамі, якія вучні атрымліваюць па асноўных школьных дысцыплінах. Атрыманыя вучнямі на іншых прадметах веды, ўменні і навыкі – асноўны паняційны навуковы апарат, храналогія сусветнай і айчыннай гісторыі, навыкі разумовай працы, праца з тэкстам, гістарычнымі крыніцамі, даведачнай літаратурай – актыўна выкарыстоўваюцца на факультатыўных занятках па курсу «Гродназнаўства» і дапаўняюцца новым, патрэбным для засваення краязнаўчых тэм, матэрыялам і практычнымі заняткамі.

Курс «Гродназнаўства» – гэта практыкаарыентаваны прадмет, накіраваны на самарэалізацыю асобы ў краязнаўчай дзейнасці. Сродкамі патрыятычнага выхавання, азнаямлення з галоўнымі культурна-гістарычнымі, нацыянальнымі, экалагічнымі каштоўнасцямі Гродзеншчыны, як часткі Беларусі, вучні накіроўваюцца на свядомую дзейнасць у напрамку глыбокага вывучэння сваёй малой Бацькаўшчыны, сваёй сям'і, а праз гэта больш глыбокае і свядомае разуменне і асэнсаванне гісторыі і сучаснасці сваёй краіны як часткі еўрапейскага і агульнасусветнага грамадства.

Курс «Гродназнаўства» дае магчымасць арганізаваць адукацыйны працэс у разнастайных формах. Апрача лекцый і практычных заняткаў, настаўнік можа планаваць наведванне музеяў, арганізацыю сустрэч са знакамітымі людзьмі, правядзенне вучнёўскіх канферэнцый, экскурсій. Неабходны кампанент практычных заняткаў – праца вучняў з артыкуламі, мемуарнай літаратурай, архіўнымі матэрыяламі і іншымі гістарычнымі крыніцамі. Усё гэта дазваляе развіваць у вучняў навыкі самастойнай даследчай і праектнай працы.

Курс «Гродназнаўства» адкрыты для кантактавання з установамі культуры, адукацыі, навукі горада, прадпрыемствамі і арганізацыямі, супрацоўніцтва з якімі дазваляе больш глыбока, змястоўна, markdownрознабакова ўсвядоміць сутнасць мінулага і сучаснасці Гродна, яго насельніцтва.

**Мэта факультатыўных заняткаў –** фарміраванне ў вучняў ведаў аб родным краі, аб Гродзеншчыне ў агульнабеларускім і сусветным кантэксце, выхаванне патрыятызму і грамадзянскасці, нацыянальнай свядомасці, любові да Бацькаўшчыны.

**Задачы:**

1) абудзіць цікавасць да роднага краю і паглыбіць веды па гісторыі, багатай матэрыяльнай, культурнай і прыроднай спадчыны Гродзеншчыны;

2) паглыбіць і ўдасканаліць веды вучняў пра Бацькаўшчыну, выкарыстоўваючы мясцовы матэрыял, спалучаючы яго з набытымі ведамі на ўроках гісторыі, роднай мовы, літаратуры, геаграфіі, абагульняючы і ўводзячы ў змест навучання элементы краязнаўства, сучаснай гістарычнай і грамадскай думкі;

3) садзейнічаць развіццю даследчых уменняў і навыкаў вучняў;

4) паспрыяць фарміраванню лагічнага мыслення, эрудыцыі, узбагачэнню слоўнікавага запасу вучняў;
5) выхоўваць беражлівыя і паважлівыя адносіны да матэрыяльнай, культурнай і прыроднай спадчыны нашага народа;
6) садзейнічаць выхаванню нацыянальнай самасвядомасці і грамадзянскаму станаўленню асобы вучняў.

Праграма арыентавана на вучняў 6 – 11 класаў і складаецца з дзвух частак: для 6–9 і 10(11) класаў. У 6–9 класах яна разлічана на 4 гады і прадугледжвае паслядоўнае пашырэнне ведаў, уменняў і навыкаў, засвоеных навучэнцамі на ўроках, а таксама атрыманне новых ведаў па гісторыі роднага краю. Праграма кожнага года навучання разлічана на 35 гадзін (2–4 гадзіны ў месяц, адзін занятак – 1–2 гадзіны).

Другая частка разлічана на адзін год для вывучэння ў 10 альбо 11 класе, на яе вывучэнне адводзіцца 35 гадзін (2–4 гадзіны ў месяц, адзін занятак – 1–2 гадзіны). Праграма прадугледжвае больш увагі надаць самастойнай і пошукава-даследчай працы вучняў пры ўмове індывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі заданняў.

Асноўнымі напрамкамі работы з'яўляюцца тэарэтычная падрыхтоўка, практычныя заняткі, самастойная работа, экскурсіі. Факультатыўныя заняткі «Гродназнаўства» зарыентаваны на актыўную даследчую дзейнасць вучняў. Адпаведна ўзросту, на занятках па «Гродназнаўстве» вучні пачынаюць авалодваць уменнямі і навыкамі навуковай працы, уключацца ў дзейнасць навукова-практычных вучнёўскіх канферэнцый, конкурсаў, праектаў. Даследчая тэматыка вучнёўскіх прац акумулюе назапашаныя вучнямі веды розных школьных дысцыплін, звяртаючы іх у рэчышча гродзенскай краязнаўчай праблематыкі.

**У выніку засваення праграмы факультатыўных заняткаў «Гродназнаўства» вучні павінны:**
**ведаць –** асноўныя гісторыка-культурныя падзеі і аб'екты свайго горада, знакамітых землякоў, галоўныя палітычныя, эканамічныя, культурныя, сацыяльныя і дэмаграфічныя працэсы, якія ўплывалі на развіццё горада Гродна;
**умець** – аналізаваць краязнаўчыя крыніцы, складаць уласны радавод, арыентавацца ў краязнаўчай літаратуры пра Гродна, рабіць рэферат, паведамленне, выступленне, канспектаваць, рыхтаваць даследчую працу на краязнаўчую тэматыку.

# Праграма факультатыўных заняткаў «Гродназнаўства»
# для VI – IX класаў
# VI клас (35 гадзін)

**Уводзіны** (4 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

Краязнаўства як навука і як практыка.

**Тэма 1. Знаёмства з горадам** (8 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Назва нашага горада.** Імя горада ў летапісах. Тлумачэнне летапіснай назвы горада. Афіцыйныя і народныя назвы горада.

**Герб і сцяг горада**. Гісторыя стварэння герба. Аб чым «гаворыць» герб Гродна. Герб Гродна ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Герб Гродна ў XIX – XX стст. Сучасны герб Гродна. Сцягі Гродна.

**Геаграфія горада**. Гродна на карце Беларусі. Рэкі і ручаі горада – Нёман, Гараднічанка, Ласасянка, Салянка, Юрыдыка. Рэльеф мясцовасці. Палеанталагічныя знаходкі. Зялёныя зоны горада. Гродзенская пушча.

**Першыя людзі на берагах Нёмана.** Археалагічныя помнікі і знаходкі першабытнага часу.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці**: лінгвістыка, герб, сцяг, геральдыка, палеанталогія, Крэйдавыя горы**.**

**Тэма 2. Гродна эпохі Кіеўскай Русі (канец X - сярэдзіна XIII стст.)**
(15 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Археалагічныя даследванні Гродна.** Вынікі першых археалагічных даследванняў. Раскопкі на Старым Замку і на Каложы ў 20–30-я гг. XX ст. Раскопкі ў другой палове XX і ў пачатку XXI ст. Навукоўцы Яўстафій Арлоўскі, Юзаф Ядкоўскі, Мікалай Воронін, Міхась Ткачоў.

**Узнікненне горада**. Першапачатковае паселішча. Заняткі жыхароў паселішча. Прычыны ўзнікнення горада.

**Планіроўка старажытнага Гродна**. Дзядзінец і вакольны горад. Заняткі жыхароў. Пасады Гродна, рынак.

**Княжацкі горад.** Нараджэнне Гродзенскага княства. Князь Усевалад Давыдавіч і яго нашчадкі. Стварэнне ўласнага радавода.

**Старажытная гродзенская архітэктура**. Мураванае дойлідства. Ніжняя і Прачысцінская цэрквы. Барысаглебская (Каложская) царква. Дойлід Пётр Міланег. Грамадзянскія пабудовы Гродна.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** плінфа, Ніжняя царква, гродзенская архітэктурная школа, Гараднічанка, гарадзішча, падол, вакольны горад, генеалогія, Барысаглебская царква, Прачысцінская царква, галаснікі, маёлікавая плітка, неф, апсіда.

### **Тэма 3. Гродна ў XIII – першай палове XVст.** (8 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Гродзенскае княства ў XIII ст**. Палітычнае становішча Гродзенскага княства. Узаемаадносіны з Руссю і Літвой. Абарончыя і культавыя збудаванні ў XIII стагоддзі.

**Гродна ў складзе Вялікага Княства Літоўскага.** Уключэнне Гродна ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Крыжацкія аблогі Гродна. Гродзенскі стараста і палкаводзец Давыд Гарадзенскі.

**Гродна часоў Вітаўта.** Палітычная барацьба Вітаўта і Ягайлы. Гродна – уладанне вялікага князя Вітаўта. Замак Вітаўта Вялікага. Будаўніцтва Фары Вітаўта. Роля Гродна ў палітыцы Вялікага Княства Літоўскага.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Верхняя царква, замак Вітаўта, крыжакі, аблогі горада, вежа-данжон, Ноенгартэн.

## VII клас (35 гадзін)

**Уводзіны** (4 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

Наш горад у другой палове XV – XVIII стст.

### **Тэма 1. Магдэбургскі Гродна (1496 – 1576 гг.)**
(9 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Жыццё горада па магдэбургскаму праву**. Сутнасць і гісторыя гарадскога самакіравання. Наданне Гродна магдэбурскага права. Самакіраванне ў Гродне. Ратуша і гарадская пячатка.

**Развіццё гарадской планіроўкі ў XV–XVI стст.** Рэзідэнцыя вялікага князя літоўскага. Планіроўка вулічнай сеткі. Рынак – грамадскі і эканамічны цэнтр горада. Гравюры М.Цюнта і Т.Макоўскага як гістарычныя крыніцы па гісторыі Гродна XVI ст.

**Насельніцтва і гаспадарка Гродна.** Этнаканфесійны склад насельніцтва горада. Развіццё рамяства і гандлю. Галіновая структура рамёстваў горада. Карпаратыўныя аб’яднанні рамеснікаў.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** магдэбурскае права, камуна, юрыдыка, ратуша, лава, радца, магістрат, войт, бурмістр, гандлёвая плошча, валочнае вымярэнне Гродна, рынак, цэх, сотні.

### **Тэма 2. Гродна ў палітыцы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у другой палове XVI – XVIII стст.**
(12 г., у тым ліку 3 г. практыкі)

**Гродна часоў Стэфана Баторыя.** Стаўленне Стэфана Баторыя да Гродна. Гродна – вялікакняжацкая і каралеўская рэзідэнцыя. Новыя пабудовы ў горадзе. Гаспадарка горада. Смерць Стэфана Баторыя ў Гродне.

**Гродзенскія соймы і соймікі.** Пастанова аб пасяджэннях кожнага трэцяга вальнага сойма Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Гродна – соймавы горад. Будаўніцтва Новага замка. Гродзенскія соймікі.

**Гродна ў войнах XVII–XVIII стст.** Ваеннае спусташэнне 1655 – 1659 гг. Гродна ў эпіцэнтры Паўночнай вайны. Гродзенская аперацыя 1706 года.

**Гаспадарка Гродна ў XVII–XVIII стст.** Стан гандлю і рамяства ў Гродне. А. Тызенгауз і яго рэформы. Мануфактуры Гродна.

**Гродна ў часы сойма 1793 г. Паўстанне 1794 г.** Палітычныя абставіны правядзення Гродзенскага сойма Рэчы Паспалітай 1793 г. «Нямое пасяджэнне» сойма ў Новым замку. Падзеі паўстання 1794 г. у Гродне. Т.Касцюшка і Я.Ясінскі.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** «Баторыеўка», замак Баторыя, сойм, соймікі, Гродзенская аперацыя Паўночнай вайны.

**Тэма 3. Культурнае жыццё горада ў другой палове XVII-XVIII стст.**
(10 г., у тым ліку 3 г. практыкі)

**Навука і адукацыя.** Культурны ўздым горада часоў Антонія Тызенгаўза. Батанічны сад у горадзе. Дзейнасць Ж-Э. Жылібера. Установы адукацыі ў Гродне. Першая гродзенская газета.

**Тэатр, музычнае і мастацкае жыццё.** Тэатр Тызенгаўза. Школьны тэатр пры езуіцкай калегіі. Гродзенскія капэлы. Архітэктурныя стылі барока і ракако. Архітэктары М. Д.Пёпельман, І. Яух і Дж. Сака. Горадабудаўнічы комплекс каралеўскага двара «Гарадніца». Жывапіс.

**Гродзенскія рэзідэнцыі вялікага князя літоўскага і караля польскага**. Новы замак. Станіславоўская сядзіба. Аўгустовак. Панямунь.

**Каталіцкія культавыя аб'екты.** Іезуіцкі, бернардзінскі, брыгіцкі, францысканскі касцёлы.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Медыцынская акадэмія ў Гродне, езуіцскі калегіўм, «Газета гродзенска», барока, ракако, Гарадніца, «Басняцкі домік», фолюш.

# VIII клас (35 гадзін)

**Уводзіны** (4 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

Ад напалеонаўскіх войнаў да Першай сусветнай вайны.

**Тэма 1. Губернскі Гродна** (8 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Становішча Гродна ў складзе Расійскай імперыі.** Адміністрацыйны статус горада. Губернская сістэма кіравання. Герб Літоўска-Гродзенскай і Гродзенскай губерні. Гродзенскія губернатары.

**Гродна ў вайне 1812 года**. Напярэдадні нашэсця Напалеона на Расію. Акупацыя Гродна напалеонаўскімі войскамі. Баі за Гродна ў снежні 1812 г.

**Эканамічнае развіццё горада ў XIX – пачатку XX ст.** Рамяство і прамысловасць. Першыя фабрыкі. Гандаль і шляхі зносін. Банкі. Сувязь.

Будаўніцтва Пецярбургска-Варшаўская чыгункі. Чыгуначны вакзал у Гродне. Судаходства па Нёману.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** маршалак шляхты, Дваранскі дэпутацкі сход, гарадская дума, рэквізіцыі, Пецярбургска-Варшаўская чыгунка, Гродзенскі паштамп, Гродзенская паштова-тэлеграфная акруга, тытунёвая фабрыка Шарашэўскага, раён Гродна «Новы Свет».

## Тэма 2. Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Гродне

(8 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Рэвалюцыйны і грамадскі рух у Гродне ў першай палове XIX ст.** Рух дзекабрыстаў на Гродзеншчыне. Паўстанне 1830 – 1831 гг. і яго наступствы. Удзельнік паўстання Міхал Валовіч.

**Паўстанне 1863 – 1864 гг.** Падзеі ў горадзе напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг. К.Каліноўскі і В.Врублеўскі. Памятныя дошкі аб падзеях паўстання на будынках Новага замка і чыгуначнага вакзала ў Гродне.

**Рэвалюцыйны рух у Гродне ў другой палове XIX – пачатку XX ст.** Рэвалюцыйныя гурткі і партыі ў Гродне. Пачатак, уздым і заняпад рэвалюцыі 1905 –1907 гг. Удзел гарадзенцаў у падзеях рэвалюцыі. Дэпутаты Дзяржаўнай думы ад Гродзенскай губерніі. Дзейнасць газеты «Наша Ніва».

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** «Таварыства ваенных сяброў», гродзенская рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя, гродзенская ваенна-следчая камісія, камітэты «белых» і «чырвоных», Бунд, «Наша Ніва», Дзяржаўная дума.

## Тэма 3. Гродна ў культурнай палітыцы Расійскай імперыі

(8 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Адукацыя і навука.** Гродзенская гімназія. Настаўнік і краязнаўца Яўстафій Арлоўскі і яго «Гродненская старина». Навуковец Яўхім Карскі. Гісторык Павел Баброўскі. Друк.

**Мастацтва і літаратура ў Гродне.** Выяўленчае мастацтва і архітэктура. Фатаграфія. Тэатр і кіно. Музыка. Літаратура. Эліза Ажэшка, Максім Багдановіч, Зоська Верас, Лейба Найдус. Фатаграфія.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** кінатэатр «Эдэм», Гродзенскае таварыства аматараў драматычнага і музычнага мастацтва «Муза», «Памятная книжка Гродненской губернии», «Гродненские губернские ведомости».

## Тэма 4. Гродна ў гады Першай сусветнай войны (1914 –1918 гг.)

(7 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Гродзенская крэпасць.** Горад-крэпасць напярэдадні германскай акупацыі. Камендант М. Кайгародаў. Баі за Гродна (жнівень – верасень 1915 г.). Сучасны стан фартоў Гродзенскай крэпасці.

**Бежанства і эвакуацыя**. Прычыны бежанства. Абставіны і маштабы бежанства. Бежанскія арганізацыі.

**Германская акупацыя Гродна.** Мерапрыемствы германскіх акупантаў. Гарадское насельніцтва ў часы акупацыі Гродна. Захаванні часоў вайны.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Фарты Гродзенскай крэпасці, рэквізіцыі, бежанства.

# IX клас (35 гадзін)

**Уводзіны** (4 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

Гродна ў XX – XXI стст.

**Тэма 1. Гродна ў 1918–1921 гг.** (4 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Гродна ў апошні перыяд Першай сусветнай вайны.** Рээвакуацыя насельніцтва. Фарміраванне новай улады. «Гродзенская рэспубліка».

**Гродна ў час польска-савецкай вайны.** Гродна – «другая сталіца БНР». Рэпрэсіі і палітыка паланізацыі ў1919 г. Гродзенскі рэўком. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Гродна.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Гродзенская рэспубліка, Гродзенскі рэўком, Віленская акруга Грамадзянскага кіравання ўсходніх зямель, савецка-польская вайна.

**Тэма 2. Гродна ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.)**
(5 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё павятовага горада.** Павятовы горад на «крэсах усходніх» Польшчы. Сацыяльна-нацыянальны склад насельніцтва. Развіццё прамысловасці і гандлю. Стан медыцыны і адукацыі.

**Грамадска-палітычнае развіццё**. Органы самакіравання і гарадская палітыка. Грамадска-палітычнае жыццё. Палітычныя партыі і рухі. Антыпольская барацьба.

**Культурнае жыццё горада**. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Канструктывізм. Гарадскі перыядычны друк. Спорт. Ураджэнцы Гродна – Юзаф Клукоўскі і Караль Румель – пераможцы летніх Алімпійскіх гульняў 1932 і 1936 гадоў. Гродзенскія дзеячы культуры. Юзаф Ядкоўскі, Ян Каханоўскі, Станіслаў Жыўна.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Рыжскі мір, «крэсы ўсходні», павятовы горад, беларускае дабрачыннае таварыства «Золак», гарнізонны касцёл, гродзенскі заапарк, гістарычны музей, Дом «Стральца», канструктывізм, «Новы свет»,

**Тэма 3. Горад Гродна ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах (1939–1945 гг.)** (8 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Гродна ў падзеях 1939 – 1941 гг.** Баі за Гродна ў 1939 г. Устанаўленне савецкай улады. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Гродне пасля ўваходжання ў склад БССР. Стварэнне Гродзенскага ўмацаванага раёна № 68. Дзмітрый Карбышаў.

**Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.** Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР 22 чэрвеня 1941 г. Героі–пагранічнікі – Віктар Усаў, Аляксандр Сівачоў, Фёдар Кірычэнка. Баі ў Румлёва. Адступленне савецкай арміі ад Гродна.

**Гродна пад фашысцкай акупацыяй**. Акупацыйны рэжым. Гродзенскія лагеры смерці. М. Кальбэ. Халакост у Гродне.

**Антыфашысцкая барацьба.** Гродзенскае падполле. Вольга Соламава, Мікалай Волкаў, Васіль Разанаў, Мікалай Багатыроў, Сяргей Лямаў, Сяргей Панасюк, Георгій Святлічны.

**Вызваленне Гродна ў ходзе аперацыі «Баграціён».** Пачатак вызвалення Гродна. Баі за левабярэжную частку Гродна. Подзвігі савецкіх воінаў пры вызваленні Гродна. Вольга Санфірава, Павел Брыкель, Міхаіл Курбатаў, Сяргей Зярноў.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Халакост, гета, Гартэн.

## Тэма 4. Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё Гродна ў 1945 - 1991 гг. (7 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Пасляваеннае аднаўленне.** Будаўніцтва і добраўпарадкаванне. Архітэктурныя страты Гродна. Новыя архітэктурныя рысы «сталінскага ампіру». Новыя мікраараёны горада: Фолюш, Дзевятоўка, Пярэселка, Вішнявец.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё горада.** Новыя галіны вытворчасці. Заводы Гродна: ГВА «Азот», ГВА «Хімвалакно», Гродзенскі завод карданых валаў, «Аўтамагнітола», завод аўтаагрэгатаў. Развіццё сацыяльнай сферы. Пасажырскі транспарт горада.

**Горад у часы «перабудовы» (1985 – 1991 гг).** Новыя грамадскія арганізацыі. Умовы эканамічнага развіцця. Праявы палітыкі «галоснасці».

**Развіццё культуры ў 1945 - 1991 гг.** Літаратары Аляксей Карпюк, Васіль Быкаў, Данута Бічэль-Загнетава, Юрка Голуб. Музыка. Рыгор Шырма. Музычныя калектывы Гродна. Спорт. Вольга Корбут, Алена Ваўчэцкая, Пётр Пачынчук. Мастакі – Алесь Ліпень, Уладзімір Церабун, Іван Пушкоў. Рэлігійная палітыка. Музеі Гродна. Развіццё драматычнага тэатра. Тэлебачанне. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Гродна. Стварэнне інстытута біяхіміі ў Гродне.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** «гродзенскія» часці, генеральны план горада, раёны горада (Пярэселка, Пышкі, Фолюш, Фарты, Вішнявец, Дзевятоўка, Румлёва), пяцігадовыя планы, беларускі ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы, ансамбль песні, музыкі і танца «Белыя росы», Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.

## Тэма 5. Сучасны Гродна

(7 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё Гродна на мяжы XX – XXI стст.** Эканамічныя змены 90-х гг XX ст. Сучасны стан прамысловасці горада. Еўрарэгіён «Неман». Горадабудаўніцтва ў пачатку XXI ст. Сучасны Гродна – буйны транспартны, прамысловы і культурны цэнтр Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі.

**Духоўнае жыццё горада**. Навука і адукацыя. Першая гродзенская гімназія і першы ліцэй у горадзе. Мастацтва і літаратура. Тэатральнае і музычнае жыццё. Выяўленчае мастацтва. Кніжная і музейная справы. Школьныя музеі г. Гродна. Навуковыя канферэнцы. Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** свабодная эканамічная зона, «Гродзенскі кірмаш», бібліятэка рэдкай кнігі, галерэя «У майстра», «Галерэя Тызенгаўза», рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.

## Праграма факультатыўных заняткаў «Гродназнаўства» для X (XI) класа (35 гадзін)

**Уводзіны** (1 г.)

Роля і месца Гродна ў сусветнай і айчынай гісторыі.

**Тэма 1. Знаёмства з горадам** (2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Назва, герб і сцяг нашага горада.** Тапаніміка. Імя горада ў летапісах. Тлумачэнне летапіснай назвы горада. Афіцыйныя і народныя назвы горада.

Вексілалогія, геральдыка. Гісторыя стварэння герба. Герб Гродна ў розныя перыяды гісторыі. Сучасны герб Гродна. Сцягі Гродна.

**Геаграфія горада**. Гродна на карце Беларусі. Рэкі горада – Нёман, Гараднічанка, Ласасянка, Салянка, Юрыдыка. Рэльеф мясцовасці. Палеанталагічныя знаходкі. Зялёныя зоны горада. Гродзенская пушча.

**Археалагічныя даследаванні Гродна.** Археалагічныя даследаванні ў вывучэнні гісторыі Гродна. Галоўныя этапы і вынікі археалагічных даследаванняў Гродна. Навукоўцы Станіслаў Жыўна, Яўстафій Арлоўскі, Юзаф Ядкоўскі, Здзіслаў Дурчэўскі, Мікалай Воронін, Фрыда Гурэвіч, Алесь Краўцэвіч, Алег Трусаў, Ігар Чарняўскі, Генадзь Семянчук, Міхась Ткачоў.

**Далетапісны Гродна.** Першыя людзі на берагах Нёмана. Археалагічныя помнікі.

**Асноўныя паняцці**: лінгвістыка, этымалогітя, герб, сцяг, вексілалогія, геральдыка, палеанталогія, Крэйдавыя горы.

**Тэма 2. Гродна эпохі Кіеўскай Русі (канец X - сярэдзіна XIII стст.)**
(2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Княжацкі горад.** Нараджэнне Гродзенскага княства. Генеалогія гродзенскіх князёў XII ст. Князі-ізгоі. Князь Усевалад Давыдавіч, князёўна Агаф'я і іх нашчадкі.

**Старажытная гродзенская архітэктура**. Гродзенскія дзядзінец і пасады. Планіроўка старажытнага Гродна. Мураванае дойлідства. Ніжняя і Верхняя, Прачысцінская царквы. Барысаглебская (Каложская) царква. Дойлід Пётр Міланег. Грамадзянскія пабудовы Гродна.

**Асноўныя паняцці:** плінфа, Ніжняя і Верхняя царквы, гродзенская архітэктурная школа, Гараднічанка, гарадзішча, падол, вакольны горад, гарадскі некропаль, генеалогія, Барысаглебская царква, Прачысцінская царква, Каложа, галаснікі, маёлікавая плітка, неф, апсіда.

## Тэма 3. Дамагдэбургскі Гродна ( да 1496 г.)

(2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Гродзенскае княства ў XIII ст**. Палітычнае становішча Гродзенскага княства. Узаемаадносіны з Руссю і Літвой. Археалагічныя знаходкі часоў княскага перыяду Гродна.

**Гродна ў складзе Вялікага Княства Літоўскага.** Крыжацкая аблогі Гродна. Гродзенскі староста і палкаводзец Давыд Гарадзенскі. Палітычная барацьба Вітаўта і Ягайлы. Гродна – уладанне вялікага князя Вітаўта. Роля Гродна ў палітыцы Вялікага Княства Літоўскага.

**Асноўныя паняцці:** крыжакі, аблогі горада, вежа-данжон, Ноенгартэн.

## Тэма 4. Магдэбургскі Гродна (1496-1576 гг.)

(2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Жыццё горада па магдэбургскаму праву**. Сутнасць і гісторыя гарадскога самакіравання. Наданне Гродна магдэбурскага права. Самакіраванне ў Гродне.

**Развіццё гарадской планіроўкі ў XV–XVIст.** Рэзідэнцыя вялікага князя літоўскага. Планіроўка вулічнай сеткі. Рынак – грамадскі і эканамічны цэнтр горада. Гравюры М.Цюнда і Т.Макоўскага як гістарычныя крыніцы па гісторыі Гродна XVI ст.

**Насельніцтва і гаспадарка Гродна.** Этнічная і канфесійная структура насельніцтва. Рэлігіі ў горадзе. Развіццё рамяства і гандлю. Галіновая структура рамёстваў горада. Карпаратыўныя аб'яднанні рамеснікаў.

**Асноўныя паняцці:** камуна, юрыдыка, ратуша, лава, радца, магістрат, войт, бурмістр, замак Вітаўта, гандлёвая плошча, валочнае вымярэнне Гродна, будаўніча-дрэваапрацоўчыя, металаапрацоўчыя, адзежна-скураныя, харчовыя рамёствы, рынак, Нямецкі рынак.

## Тэма 5. Гродна ў палітыцы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай XVI – XVIII ст. (5 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Горад часоў Стэфана Баторыя.** Стаўленне Стэфана Баторыя да Гродна. Гродна – вялікакняжацкая і каралеўская рэзідэнцыя. Новыя пабудовы ў горадзе. Гаспадарка горада. Атэіст Каспар Бекеш. Смерць Стэфана Баторыя ў Гродне.

**Гродзенскія соймы і соймікі.** Соймы ў Гродна. Будаўніцтва Новага замка. Гродзенскія соймікі.

**Гродна ў войнах XVII–XVIII стст.** Ваеннае спусташэнне 1655 – 1659 гг.. Гродна ў эпіцэнтры Паўночнай вайны. Гродзенская аперацыя. Гродзенскі "нямы" сойм 1717 г. і яго значэнне.

**Гаспадарка Гродна ў XVII–XVIII стст.** Стан гандлю і рамёстваў у Гродне. А. Тызенгауз і яго рэформы ў рэчышчы палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай. Мануфактуры Гродна.

**Горад у часы сойма 1793 г. Паўстанне 1794 г.** Палітычныя абставіны правядзення Гродзенскага сойма Рэчы Паспалітай 1793 г.. «Нямое

пасяджэнне» ў Новым замку. Падзеі паўстання 1794 г. Паплечнік Т. Касцюшкі – Якуб Ясінскі.

**Культурнае жыццё горада ў XVI–XVIII стст.** Развіццё архітэктуры горада. Архітэктары Д.М. Пёпельман, І. Яух і Дж. Сака. Культавае дойлідства Гродна. Установы адукацыі ў Гродне. Адукацыйны цэнтр Гродна – езуіцкі калегіум. Культурны ўздым горада часоў Антонія Тызенгаўза. Дзейнасць Ж-Э. Жылібера. Медыцынская акадэмія ў Гродне. Тэатр. Гродзенскія рэзідэнцыі вялікага князя літоўскага і караля польскага. Новы замак. Станіслававоўская садзіба. Аўгустовак. Панямунь.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** «Баторыеўка», замак Баторыя, сойм, соймікі, Гродзенская аперацыя Паўночнай вайны, персіяры, Медыцынская акадэмія ў Гродне, езуітскі калегіўм, «Газета гродзенска», барока, ракако, Гарадніца.

**Тэма 6. Губернскі Гродна** (2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Становішча Гродна ў складзе Расійскай імперыі.** Арганізацыя кіравання. Межы Гродзенскай губерніі. Герб Літоўска-Гродзенскай і Гродзенскай губерні. Гродзенскія губернатары. Губернатар Пётр Сталыпін. Сістэма губернскага кіравання.

**Гродна ў вайне 1812 года**. Месца Гродна напярэдадні нашэсця Напалеона на Расію. Акупацыя Гродна напалеонаўскімі войскамі. Баі за Гродна ў снежні 1812 г. Помнікі вайны 1812 г. у сучасным Гродна.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё горада ў складзе Расійскай імперыі.** Рамяство і прамысловасць. Гандаль і шляхі зносін. Банкі. Сувязь. Чыгуначны вакзал у Гродне. Судаходства па Нёману. Рымарства і ліхвяртства. Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва Гродна. Яўрэі ў эканамічным і культурным жыцці Гродна. Гродна ў Першым ўсерасійскім перапісу насельніцтва 1897 г.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** маршалак шляхты, Дваранскі дэпутацкі сход, гарадская дума, рэквізіцыі, Пецярбургска-Варшаўская чыгунка, Гродзенскі паштамп, Гродзенская паштова-тэлеграфная акруга, тытунёвая фабрыка Шарашэўскіх, раён Гродна «Новы Свет».

**Тэма 7. Рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Гродне** (2 г.)

**Рэвалюцыйны і грамадскі рух у Гродне ў першай палове XIX ст.** Рух дзекабрыстаў. «Таварыства ваенных сяброў». Сёстры Рукевіч. Масонская ложа ў Гродне. Паўстанне 1830 – 1831 гг. Удзельнік паўстання Міхал Валовіч. Гродзенскі губернатар М. Мураўёў.

**Паўстанне 1863 – 1864 гг.** Падзеі ў горадзе напярэдадні і падчас паўстання 1863 – 1864 гг. Памятныя дошкі аб падзеях паўстання на будынках Новага замка і чыгуначнага вакзала ў Гродне.

**Рэвалюцыйны рух у Гродне на мяжы XIX – XX стст.** Рэвалюцыйныя гурткі і партыі ў Гродне. Пачатак, уздым і заняпад рэвалюцыі. Удзел гарадзенцаў у падзеях рэвалюцыі 1905 –1907 гг. Рэвалюцыянер С. Галюн.

Дэпутаты Дзяржаўнай думы ад Гродзенскай губерніі. Дзейнасць газеты «Наша Ніва».

**Асноўныя паняцці:** «Таварыства ваенных сяброў», масоны, «Сябры чалавецтва», гродзенская рэвалюцыйна-дэмакратычная арганізацыя, гродзенская ваенна-следчая камісія, камітэты «белых» і «чырвоных», Бунд, тэрор, «Наша Ніва», Дзяржаўная дума.

**Тэма 8. Гродна ў культурнай палітыцы Расійскай імперыі**

(2 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Асвета і навука.** Гродзенская гімназія. Навуковец Яўхім Карскі і яго кніга «Беларусы». Настаўнік і краязнаўца Еўстафій Арлоўскі і яго «Гродненская старина». Яўрэйская адукацыя. Губернскія ведамасці.

**Мастацтва ў Гродна.** Выяўленчае мастацтва і архітэктура. Фатаграфія. Тэатр і кіно. Музыка. Літаратура. Гісторык Павел Баброўскі, літаратары Эліза Ажэшка, Максім Багдановіч, Зоська Верас, Лейба Найдус. Дактары Аляксандр Тальгейм і Людвіг Замегоф. Гродзенскі гурток беларускай моладзі.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці :** кінатэатр «Эдэм», Гродзенскае таварыства аматараў драматычнага і музычнага мастацтва «Муза», «Памятная книжка Гродненской губернии», «Гродненские губернские ведомости».

**Тэма 9. Гродна ў Першай сусветнай вайне** (2 г.)

**Гродненская крэпасць.** Горад-крэпасць напярэдадні германскай акупацыі. Спробы выратавання XX армейскага корпуса. Баі за Гродна летам 1915 г. Камендант крэпасці М. Кайгародаў. Інжынер У. Зварыкін. Сучасны стан фартоў Гродзенскай крэпасці.

**Бежанства і эвакуацыя**. Прычыны бежанства. Абставіны і маштабы бежанства. Бежанскія арганізацыі.

**Германская акупацыя Гродна.** Мерапрыемствы акупантаў. Гарадское насельніцтва ў часы акупацыі Гродна. Пахаванні часоў вайны.

**Гродна ў апошні перыяд Першай сусветнай вайны.** Рээвакуацыя насельніцтва. Фармаванне новай улады. «Гродзенская рэспубліка».

**Асноўныя паняцці:** Фарты Гродзенскай крэпасці, рэквізіцыі, бежанства, гродзенская крэпасная акруга, Гродзенская рэспубліка.

**Тэма 10. Гродна ў складзе Польшчы (1921-1939 гг.)**

(3 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Гродна ў час польска-савецкай вайны.** Гродна – «другая сталіца БНР». Рэпрэсіі і палітыка паланізацыі ў1919 г. Гродзенскі рэўком. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Гродна.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё павятовага горада.** Павятовы горад на «крэсах усходніх» Польшчы. Сацыяльна-нацыянальны склад насельніцтва. Развіццё прамысловасці і гандлю. Стан медыцыны, асветы і адукацыі.

**Грамадска-палітычнае жыццё**. Органы самакіравання і гарадская палітыка. Грамадска-палітычнае жыццё: палітычныя партыі і рухі. Антыпольская барацьба. Кіраўнік БСРГ Браніслаў Тарашкевіч.

**Культурнае жыццё горада**. Архітэктура і горадабудаўніцтва. Перабудовы Фары Вітаўта. Эклектыка, мадэрн, канструктывізм. Гарадскі перыядычны друк. Спорт. Гродзенскія дзеячы культуры Юзаф Ядкоўскі, Ян Каханоўскі, Зоф'я Налкоўская.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** Гродзенскі рэўком, Віленская акруга Грамадзянскага кіравання ўсходніх зямель, польска-савецкая вайна, Рыжскі мір, «крэсы ўсходні», павятовы горад, беларускае дабрачыннае таварыства «Золак», гарнізонны касцёл, гродзенскі заапарк, гістарычны музей, Дом «Стральца», канструктывізм, «Новы свет»,

## Тэма 11. Гродна ў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайнах (1939–1945 гг.) (3 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Гродна ў падзеях 1939 – 1941 гг.** Баі за Гродна ў 1939 г. Устанаўленне савецкай улады. Гаспадарчыя і культурныя пераўтварэнні ў Гродне пасля уз'яднання з БССР. Стварэнне Гродзенскага ўмацаванага раёна № 68.

**Пачатак фашысцкай агрэсіі ў чэрвені 1941г.** Нападзенне нацысцкай Германіі на СССР. Героі–пагранічнікі. Віктар Усаў, Аляксандр Сівачоў і Фёдар Кірычэнка. Баі ў Румлёва. Адступленне савецкай арміі ад Гродна. Дзмітрый Карбышаў.

**Гродна пад фашысцкай акупацыяй**. Акупацыйны рэжым. Гродзенскія лагеры смерці. М.Кальбэ. Халакост у Гродна. Гродзенскае падполле. Вольга Соламава, Мікалай Волкаў, Васіль Разанаў, Сяргей Лямаў, Мікалай Багатыроў, Сяргей Панасюк, Георгы Святлічны.

**Вызваленне Гродна ў ходзе аперацыі «Баграціён».** Гродна ў планах «Беластоцкай аперацыі». Вызваленне правабярэжнай частцы Гродна. Вызваленне левабярэжнай часткі горада. Подзвігі савецкіх воінаў пры вызваленні Гродна. Вольга Санфірава, Павел Брыкель, Міхаіл Курбатаў.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** фольксдойч, гета, Гартэн.

## Тэма 12. Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае развіццё Гродна ў 1945-1991 гг. (3 г., у тым ліку 1 г. практыкі)

**Пасляваеннае аднаўленне.** Будаўніцтва і добраўпарадкаванне. Архітэктурныя страты Гродна. Новыя архітэктурныя рысы «сталінскага ампіру». Новыя мікраараёны горада: Фолюш, Дзевятоўка, Пярэселка, Вішнявец.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё горада.** Новыя галіны вытворчасці. Заводы Гродна: ГВА «Азот», ГВА «Хімвалакно», Гродзенскі завод карданых валаў, «Аўтамагнітола», завод аўтаагрэгатаў. Развіццё сацыяльнай сферы. Пасажырскі транспарт горада.

**Горад у часы «перабудовы» (1985 – 1991 гг).** Новыя грамадскія арганізацыі. Умовы эканамічнага развіцця. Праявы палітыкі «галоснасці».

**Развіццё культуры ў 1945 - 1991 гг.** Пісьменнікі Аляксей Карпюк і Васіль Быкаў. Музыка. Рыгор Шырма. Музычныя калектывы Гродна. Спорт. Вольга Корбут, Пётр Пачынчук. Мастакі – Алесь Ліпень, Уладзімір Церабун, Іван Пушкоў. Рэлігійная палітыка. Музеі Гродна. Развіццё драматычнага тэатра. Вышэйшыя навучальныя ўстановы Гродна. Стварэнне інстытута біяхіміі ў Гродне.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** «гродзенскія» часці, генеральны план горада, раёны горада Пярэселка, Пышкі, Фолюш, Фарты, Вішнявец, Дзевятоўка, Румлёва, пяцігадовыя планы, беларускі ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы, ансамбль песні, музыкі і танца «Белыя росы», Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.

## Тэма 13. Сучасны Гродна

(4 г., у тым ліку 2 г. практыкі)

**Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае жыццё Гродна на мяжы XX – XXI стст.** Эканамічныя перамены 90-х гг XX ст. Сучасны стан прамысловасці горада. Еўрарэгіён «Неман». Горадабудаўніцтва ў пачатку XXI ст. Сучасны Гродна – буйны транспартны, прамысловы і культурны цэнтр Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі.

**Духоўнае жыццё горада**. Навука і адукацыя. Першая гродзенская гімназія і першы ліцэй у горадзе. Мастацтва і літаратура. Тэатральнае і музычнае жыццё. Гродзенская капэла. Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Выяўленчае мастацтва. Мастакія галерэі Гродна. Новыя помнікі горада. Гродзенскі заапарк. Кніжная і музейная справы. Музеі Гродна. Навуковыя канферэнцыі «Наш Радавод». Краязнаўчая думка пра Гродна. Канфесійнае жыццё горада.

**Экалагічны стан горада**. Зялёныя зоны горада. Флора і фауна Гродна. Рэкі і ручаі горада. Добраўпарадкванне горада.

**Мой радовод.** Генеалогія. Анамастыка. Правілы стварэння ўласнага радаводу. Сямейны летапіс. Генеалагічныя даследаванні.

**Абагульняючы занятак**

**Асноўныя паняцці:** свабодная эканамічная зона «Гроднаінвест», трансмежавы саюз «Еўрарэгіён «Неман », «Гродзенскі кірмаш», канферэнцыі «Наш Радавод», бібліятэка рэдкай кнігі, «Кронан», галерэя «У майстра», «Галерэя Тызенгаўза», рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур, генеалогія.

**Асноўная літаратура**

1. Біяграфія гарадзенскіх вуліц: Ад Фартоў да Каложы. / А.Вашкевіч, А.Госцеў, В.Саяпін [і інш.]. – Гродна, 2012.
2. Гародня X-XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. / П.Баравік, Ю.Гардзееў, А.Ерашэвіч [і інш.]. – Гродна, 2014.
3. Гостев, А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990). /А.П. Гостев, В.В.Швед . – Гродно: НВК «Пергамент», 1993. – 329 с.
2. Гродназнаўства: дапам. /А.П. Госцеў [і інш.]; пад агул. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнелюка. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 219 с.
3. Лихачёв, Д.С. Краеведение как наука и как деятельность. // Д.С. Лихачёв. Русская культура. – М. 2000. – С. 159-174.
4. Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – 712 с.
5. Пол Томпсон. Голос прошлого. Устная история. – М.: Издательство «Весь мир», 2003.
6. Улашчык, М. Выбранае. / М.Улашчык – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001.

**Дадатковая літаратура**

1. Аляксееў, Л.В. Гродна і помнікі Панямоння/ Л.В. Аляксееў. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 191 с.
2. Богданович, А.В. Города Белоруссии: Краткий экономический очерк. /А.В. Богдановіч, П.А. Сидоров – Минск, 1967. – 181 с.
3. Воронин, Н.Н. Древний Гродно: по материалам археол. раскопок 1932–1949 гг./ Н.Н. Воронин. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 239 с.
4. Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: бібліяграфічны даведнік / пад рэд. В.М. Чарапіцы. – Гродна: ГрДУ, 1999. – 595 с.
5. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня/ Ю. Гардзееў. – Гародня-Wroclaw, 2008. – 382 с.
6. Гостев, А.П. Королевский город Гродно. Путеводитель./ А.П.Гостев, А.А. Семенчук – Мн: Рифтур, 2006. – 72 с.
7. Граблевский, И.С. Юные герои Гродненщины/ И.С.Граблевский. – Минск: Юнацтва, 1981. – 152 с.
8. Граблевский, И.С. Гродно и окрестности: справочник-путеводитель./ И.С.Граблевский. – Минск: Полымя, 1987. – 160 с.
9. Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў/ Склад., запіс, апрац. А.М. Ненадаўца. – Мінск: Беларусь, 1999. – 386 с.
10. Гродна: гісторыя, сімвалы, знакі, асобы / Склад. Я.М.Жабрун. – Гродна: RISE, 1996. – 22 с.
11. Гродна і гродзенцы / склад. Я.М. Жабрун. – Гродна: ГрДУ, 1999.– 32 с.
12. Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.). – Гродна: ГАУД, 1995. – 207 с.
13. Гродненский государственный историко-археологический музей:. путеводитель по залам / сост. Е.А.Соловьёва [ и др. ] – Минск.: Полымя, 1986. – 240 с.
14. Гродно: исторический очерк. – Минск: Госиздат БССР, 1960. – 150 с.
15. Гродно: исторический очерк/ под ред. З.Ю.Копысского, Б.М.Фиха. Изд.2-е. – Минск: Беларусь, 1964. – 262 с.
16. Гродно-Grodno / И.И.Ковкель, Я.Н.Мараш. - Минск:Полымя, 1987. – 96 с.
17. Гродно: историко-экономический очерк / И.П. Крень [и др.] – Минск: Полымя, 1988. – 240 с.
18. Гродно: энциклопедический справочник. – Минск: БелСэ, 1989. – 438 с.
19. Данскіх, С.У. Гародня ў паўстанні 1830-1831 гг./ С.У. Данскіх // Гарадзенскія апосталы: гістарычны альманах. Вып. 2. – Гародня: Гродзенскае маладзёжнае аб’яднанне «Альянс імя Вітаўта Вялікага», 1999. – 23 с.
20. Дарогамі Максіма Багдановіча. – Гродна: ГАУД, 1991. – 32 с.
21. Евреи Гродно Очерки истории и культуры. – Гродно: Бел. гос. музей истории

религии, общественное объединение «Гродненский еврейский общинный дом «Менора», 2000. – 124 с.
22. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1986. – 370 с.
23. Историки Гродненщины: Материал в помощь лектору. – Гродно: ГОУТ, 1989. – 27 с.
24. Их именами названы: Энцикл. справочник. – Минск: БелСЭ, 1987. – 711 с.
25. Карнялюк, В. Гродзенскі эпізод Першай сусветнай вайны. / В. Карнялюк// Беларуска-нямецкія грамадска-культурныя ўзаемаадносіны: гісторыя, сучаснасць, перспектывы // Albarutenika -7 – Мінск: Навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, 1996. – С. 34 – 38.
26. Квитницкая, Е.Д. Планировка Гродно в XVI–XVIII вв. //Архитектурное наследство. – 1964. – №17. – С. 11-38.
27. Кітурка, Ю.В. Гродзенскія замкі: гісторыка-архітэктурны нарыс./ Ю.В. Кітурка, В.М. Царук – Гродна: ГАУД, 1997. – 44 с.
28. Кишик, Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Мн.: Бел. Наука, 2007. – 303 с.
29. Климат Гродно. – Ленинград: Гидрометеоиздат, 1982. – 159 с.
30. Книга героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП «Гродн. тип.», 2004. – 168 с.
31. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XVI–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой/ А. Краўцэвіч – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
32. Краўцэвіч, А.К. Гродзенскі замак: Нарыс/ А. Краўцевіч. – Мн.: Юнацтва, 1993. – 47 с.
33. Кудряшев, В.И. Гродно./ В.И. Кудряшев – М.: Госиздат литературы по строительству, архитектуре и строительным материалам/ В.И. Кудряшов, 1960. – 128 с.
34. Маліноўская, Т.Р. Архітектура горада Гродна (X ст. да 1939 г.). Вучэбны дапаможнік для студэнтаў. / Т.Р. Маліноўская – Гродна: ГрДУ, 2005. – 88 с.
35. Мяшчэнка, Я.М. Геаграфія Гродзенскай вобласці/ Я.М. Мяшчэнка, М.У. Амельянчук, В.М. Фунт. – Брэст: Выдавецтва С.Лаўрова, 2000. – 107 с.
36. Наш край: Древнейшая история Гродненщины: Материал в помощь лектору, пропагандисту, учителю/ материал. подгот. С.В. Полуцкая. – Гродно: ГОУТ, 1990. – 20 с.
37. Наш край: Гродненщина в составе Великого княжества Литовского и Речи Посполитой: Материал в помощь лектору, пропагандисту, учителю. / Материал подгот. Я.Н. Мараш, С.В. Полуцкая. – Гродно: ГОУТ, 1990. – 36 с.
38. Наш край: Гродненщина в конце XVIII – первой половине XX вв.: Материал в помощь лектору, пропагандисту, учителю. / Матер. подгот. В.В. Швед, С.Е. Сельверстова, П.И. Леута. – Гродно: ГОУТ, 1990. – 42 с.
39. Орловский, Е.Ф. Гродненская старина. / Е. Орловский.– Гродна, 1910. – 343 с.
40. Павач, А. Под крылом Коложи. Карманная история Гродно./ А. Павач. – Гродно: Юрса Принт, 2014.
41. Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – 712 с.
42. Пяткевіч, А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік/ А. Пяткевіч.– Гродна: ГрДУ, 2000. – 356 с.
43. Ткачёв, М.А. Замки Белорусии. / М.А. Ткачёв. – Минск: Полымя, 1987. – 222 с.
44. Трусаў, А. Стары замак у Гродне XI-XVIII стст.: Гіст.-археал. нарыс/ А. Трусаў, В. Собаль, Н. Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.
45. Трусов, И. Православные храмы Гродно/ И. Трусов. – Минск-Гродно: Мэджык Бук, 2008. – 100 с.
46. Трусаў, І. Серыя артыкулаў пра вуліцы Гродна, надрукаваная ў газеце “Біржа інфармацый”. – 1998. - №№ 12-44.
47. Токць, С. Скідзель і яго ваколіцы: жывая гісторыя. / С. Токць, М. Дзеляноўскі. –

Мінск,: Тэхналогія, 2014.
48. Царук, В.М. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей/ В.М. Царук. – Гродна: ГАУПП "Гродзенская друкарня", 2000. – 22 с.
49. Цітоў, А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі/ А.К. Цітоў. – Мінск: Полымя, 1993. – 239 с.
50. Цітоў, А.К. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі/ А.К. Цітоў. – Мінск: РІВШ БДУ, 1999. – 176 с.
51. Чантурия, В.А. Архитектурные памятники Гродно/ В.А. Чантурия. – Минск: Полымя, 1983. – 31 с.
52. Чарапіца, В.М. Са скарбніцы кніжных паліц: Нарысы пра аўтографы даследчыкаў гісторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст./ В.М. Чарапіца – Мінск: БелНДЦДААС, 1994. – 174 с.
53. Чарнякевіч, А. Беларускі Нацыянальны Рух у Гародні (1918 –1920 гады)/ А. Чарнякевіч // Гарадзенскія апосталы: гістарычны альманах. Вып. 1. – Гародня: Гродзенскае маладзёжнае аб'яднанне «Альянс імя Вітаўта Вялікага», 1998. – 49 с.
54. Черепица, В.Н. Польское национальное движение в Белоруссии (последняя треть XIX века): факты-события-комментарии/ В.Н. Черепица. – Гродно: Б.и., 1996. – 143 с.
55. Черепица, В.Н. Дай нам руку в непогоду: Деятели русской культуры XIX – начала XX веков и Гродненщина. Историко-документальные очерки и публицистика/ В.Н. Черепица – Гродно: Б.и., 1997. – 130 с.
56. Черепица, В.Н. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 1999. – Часть I. – 320 с.
57. Черепица, В.Н. Гродненский православный некрополь (с древнейших времён до начала XX века)/ В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2001. – 230 с.
58. Черепица, В.Н. …Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX-XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): монография/ В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2003. – 420 с.
59. Черепица, В.Н. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней)/ В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2005. – Часть II. – 440 с.
60. Швед, В.В. По следам гродненской старины/ В.В. Швед. – Гродно: Лидская типография, 1993. – 70 с.
61. Швед, В.В. Падзеі і постаці гродзенскай даўніны/ В.В. Швед. – Гродна: ГАУД, 1995. – 176 с.
62. Швед, В.В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830 – 1850-е годы)/ В.В. Швед. – Гродно: ПКФ «Орбикс », 1995. – 195 с.
63. Швед, В.В. Горадзен. Аповяды з гісторыі горада (10 ст. – сярэдзіна 16 ст.). / В.В. Швед, А.П. Госцеў, А.А. Дабрыян. – Гродна: Гродзенская ўзбуйненая друкарня, 1996. – 60 с.
64. Швед, В.В. Горадня. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.)/ В.В. Швед, А.П. Госцеў, А.А. Дабрыян. – Гродна: Пергамент, 1997. – 140 с.
65. Швед, В.В. Губернскі Гродна: Аповяды з гісторыі горада (канец XVIII - пач. XX ст.) /В.В. Швед. – Баранавічы: Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня, 2003. –168 с.
66. Экологические экскурсии по лесопарку Румлёво / Д.М. Андреева, [ и др. ]– Изд. 2-е, доп. и испр. –Гродно: ГОУПП «Гродненская типография», 2007.